Зубчонак, Н. А.

Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,

/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

### 1.3.5. СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫЯ ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ

Напачатку ХХ ст. у Беларусі пачалі актыўна стварацца газеты і часопісы, якія ў некаторым сэнсе адмежаваліся ад грамадска-палітычных праблем і былі адрасаваны асобным прадстаўнікам пэўных сфер дзейнасці. Спецыялізаваныя (галіновыя) выданні асвятлялі пытанні сельскай і лясной гаспадаркі, медыцыны, адукацыі, развіцця навукі, тэхнікі і інш. У Паўночна-Заходнім краі друкаваліся: «Агрономический листок» (двухтыднёвы дадатак да «Витебского вестника», 1912 г.); «Белорусский учительский вестник» (штомесячны часопіс для настаўнікаў, 1910 г., Магілёў); «Медицинское дело» (1910, Вільня); «Минские врачебные известия» (1910–1915 гг.); «Педагогическое дело» (1911–1914 гг., Гродна); «Саха» (сельскагаспадарчы часопіс, 1912–1915 гг.) і інш. Матэрыялы па гэтых праблемах змяшчалі таксама і іншыя выданні («Минское слово», «Северо-Западная жизнь», «Полесье»). Паколькі большая іх частка існавала на дзяржаўныя сродкі, магчымасці былі абмежаваныя. З'яўленне падобных газет і часопісаў ў Паўночна-Заходнім краі сведчыла аб яго эканамічным і культурным развіцці. У 1904 г. на тэрыторыі Беларусі налічвалася толькі 11 перыядычных выданняў такога характару. У 1906 г. іх колькасць склала ўжо 23 назвы [57, с. 517].

Побач з выданнямі вузка спецыяльнага характару ў Беларусі выходзілі літаратурна-асветніцкія газеты і часопісы. Некаторыя грамадска-палітычныя газеты таксама мелі падзагаловак «літаратурная» («Белорусский вестник. Газета общественная и литературная»; «Жизнь провинции. Ежедневная общественно-политическая, экономическая и литературная газета» і інш.). У пэўных выпадках такая назва давала магчымасць выданню на пэўны час адцягнуць увагу ўладаў ад сваіх грамадска-палітычных поглядаў.

У міжрэвалюцыйны час робяцца спробы выдаць спецыяльную газету або часопіс, якія асвятлялі б толькі літаратурныя пытанні. У 1911--1912 гг. у Гомелі выдаваўся двухтыднёвы літаратурна-мастацкі часопіс «Зорницы», крыху пазней, там жа спрабавалі наладзіць выпуск «Гомельского театрально-музыкального вестника» (выйшла толькі тры нумары). У 1911 г. у Гомелі была заснавана літаратурна-грамадская газета «Лучи» (выйшла два нумары). У Мінску ў 1912 г. убачылі свет пяць нумароў літаратурнага часопіса «Минский огонёк». Гэта выданне

з’яўлялася дадаткам да «Минской газеты-копейки». Падобныя выданні ў Беларусі ў гэты час былі мала распаўсюджаны. Сапраўдным выключэннем змаглі стаць толькі першыя беларускамоўныя газеты і часопісы, якія згуртавалі вакол сябе лепшыя сілы нацыянальнай інтэлігенцыі, выдатных пісьменнікаў і публіцыстаў («Наша доля», «Наша ніва», «Лучынка», «Маладая Беларусь»).

Беларуская літаратура ў пачатку XX ст. станавілася на новы шлях паскоранага развіцця, старанна засвойваючы традыцыі суседніх літаратур, фарміруючы свой уласны напрамак і стыль. Тыя ж працэсы адбываліся ў культуры і ў публіцыстыцы. Практычна кожнае тагачаснае рускамоўнае выданне таксама мела аддзел, які змяшчаў матэрыялы аб развіцці расійскай ці замежнай культуры. Праблемы беларускай культуры часта проста не ўзнімаліся.

Новым тыпам перыядычнага выдання разглядаемага перыяду сталі газеты і часопісы для дзяцей і моладзі. Традыцыі дзіцячай журналістыкі былі закладзены ў XVIII ст. у Расіі М. І. Навіковым (часопіс «Детское чтение»). У Беларусі ў пачатку XX ст. выданні такога тыпу толькі пачыналі з’яўляцца. У Вільні з 1905 па 1912 г. выходзіў часопіс для дзяцей «Зорька» (рэдактар-выдавец С. А. Кавалюк), а таксама дадатак да яго «Педагогические записки».

Папулярнасць у гэты час набыў штомесячнік беларускай моладзі «Лучынка». Яго з’яўленне звязана з прыездам ў Мінск у 1913 г. А. Пашкевіч. Афіцыйны дазвол на выданне атрымаў А. Уласаў, але фактычна ўсю рэдактарскую работу выконвала Цётка. Часопіс прызначаўся вясковай моладзі і выходзіў у Мінску ў 1914 г. Выданне насіла культурна-асветніцкі характар. У шасці нумарах часопіса на беларускай мове змяшчаліся разнастайныя матэрыялы па гісторыі і культуры Беларусі, рэдакцыя друкавала разважанні аб развіцці капіталістычных адносін у краі; шмат месца адводзілася публікацыі беларускіх літаратурных твораў: апавяданняў У. Галубка, З. Бядулі, вершаў Я. Купалы, Цёткі, А. Паўловіча і іншых аўтараў.

У тым жа годзе рэдакцыя асобным выданнем выпусціла зборнік апавяданняў для дзяцей. На вокладцы стаяла лічба 1. Існуе меркаванне, што планавалася стварыць серыю дзіцячых кніг [76, с. 192]. С. Х. Александровіч пісаў, што ў гэты час у Мінску збіраліся выдаваць ілюстраваны часопіс для дзяцей «Іскрачка», аднак задума гэта таксама не ажыццявілася.

У 1914 г. у Пецярбургу студэнты-беларусы наладзілі выпуск часопіса «Раніца». У чэрвені выйшаў толькі адзін нумар. Выданне адрасавалася беларускай моладзі, народнай інтэлігенцыі, якой неабходна было рыхтавацца да актыўнай грамадскай дзейнасці.

З’яўленне маладзёжных выданняў на беларускай мове было з’явай прагрэсіўнай, у першую чаргу, у справе папулярызацыі адраджэння нацыянальнай культуры.

Падзеі першай рускай рэвалюцыі ў Расіі выклікалі да жыцця цэлы шэраг сатырычных выданняў. У 1906 г. іх было каля 300 [35, с. 42]. Паўночна-Заходні край значна адставаў ад цэнтральнай часткі краіны ў плане распаўсюджання выданняў новых тыпаў. Часопіс «Крапіва», які выходзіў у Вільні ў 1912 г. на беларускай мове, стаў першым беларускім сатырычным выданнем. Часопіс друкаваў фельетоны, анекдоты, гумарэскі, сатырычныя сцэнкі. Сучаснікі па-рознаму ацэньвалі змест выдання. Напрыклад, М. Багдановіч папракаў выдаўцоў у адсутнасці сатырычнай вастрыні, а Я. Колас прыхільна ставіўся да яго, палічыўшы даволі цікавым. Выданне часопіса было спынена пасля першага нумара. У 1913 г. выйшла ўсяго чатыры нумары штотыднёвага часопіса сатыры і гумару «Ковенский будильник». Яго традыцыі спрабаваў працягнуць «Северо-Западный будильник», які друкаваўся там жа. Часопісы былі зачынены па прычыне фінансавых цяжкасцей.

Адзіным выданнем у Беларусі, якое асвятляла спартыўныя падзеі, стаў штотыднёвы часопіс «Спорт». Яго выпуск быў наладжаны ў Вільні ў 1913 г. Выйшла толькі чатыры нумары. У гэты час спартыўная інфармацыя на старонках беларускага друку была прадстаўлена даволі слаба. Некаторыя перыядычныя выданні мелі спецыяльныя рубрыкі «Спорт» («Гомельская копейка», «Северо-Западная копейка», «Минская газета-копейка», «Минский голос» і інш.).

У працэсе рэвалюцыйна-дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі складвалася тыпалогія перыядычных выданняў, павялічвалася іх колькасць, змянялася перыядычнасць выхаду. Сістэма друку Паўночна-Заходняга краю пачынала паўнацэнна развівацца, адпавядаючы запатрабаванням рэчаіснасці. Беларуская прэса імкнулася быць прадстаўленай практычна ўсімі відамі перыядычных выданняў. Спецыялізаваныя газеты і часопісы складалі значную яе частку. Важнай з’яўлялася і тая акалічнасць, што сярод іх не на апошнім месцы стаялі выданні на беларускай мове.